# Аб асноўных этапах рэалізацыі маштабнага праекта «Беларуская інтэграваная сэрвісна-разліковая сістэма» дакладзена на пасяджэнні прэзідыума Саўміна

Праца па стварэнні Беларускай інтэграванай сэрвісна-разліковай сістэмы (БІСРС) ажыццяўляецца ў комплексе з працэсам ўкаранення біяметрычных дакументаў, якія заменяць традыцыйны пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Асноўныя кампаненты БІСРС ўжо створаныя альбо будуць уведзены ў эксплуатацыю да канца года. Завяршаюцца работы па правядзенню доследнай эксплуатацыі пілотнай зоны БИСРС. Пра гэта 25 жніўня на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праінфармаваў міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган.

У сваім дакладзе міністр спыніўся на асноўных этапах рэалізацыі маштабнага праекта.

*ДАВЕДАЧНА:*
*Беларуская інтэграваная сэрвісна-разліковая сістэма (БІСРС) - комплекс інфармацыйных сістэм і рэсурсаў, які прызначаны для ідэнтыфікацыі карыстальнікаў (фізічных і юрыдычных асоб) з ужываннем ідэнтыфікацыйных карт (ID-карт) у мэтах аказання ім электронных паслуг (у тым ліку адміністрацыйных працэдур) на аснове адзіных правілаў. Стварэнне БІСРС з'яўляецца адным з ключавых мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016-2020 гады.*

Як адзначыў Канстанцін Шульган, стварэнне БІСРС - важны крок да развіцця электроннага ўрада. БИСРС аблегчыць і спросціць дыялог паміж грамадзянамі і дзяржавай шляхам памяншэння бюракратычных патрабаванняў для аказання электронных паслуг, што таксама будзе спрыяць памяншэнню карупцыйных праяў.

Гэтая сістэма выконвае найважнейшую задачу электроннага ўрада - аўтаматызацыю абслугоўвання грамадзян і юрыдычных асоб у рамках выканання адміністрацыйных працэдур і электронных паслуг, дзе галоўным элементам з'яўляецца ўкараненне электроннага пасведчання асобы на базе ID-карты, стварэнне і развіццё дзяржаўнага партала электронных паслуг.

**Алгарытмы дзеянняў арганізацый пры ажыццяўленні іх дзейнасці, звязанай з ідэнтыфікацыяй грамадзян пры прад'яўленні ID-карты.**

**Малюнак 1:** У выпадку дастатковасці звестак, змешчаных на ID-карце, работнік можа візуальна ідэнтыфікаваць грамадзяніна па фатаграфіі на ID-карце.

**Малюнак 2:** У выпадку неабходнасці атрымання адсутных звестак на ID-карце з выкарыстаннем адзінага партала электронных паслуг

**Малюнак 3:** У выпадку выкарыстання ўласнай інфармацыйнай сістэмы

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/25-08-2020-6691*